ры выканання карагодаў. Пашыраны ў шэрагу варыянтаў колавага тыпу ў маналогавай і дыялогавай формах. Асн. гулец — «заінька», абраны пры дапамозе лічылкі (ці інш. спосабам), становіцца ў сярэдзіну кола (ці па-за ім) і сродкамі выяўл. пластыкі і разнастайных рухаў, асабліва скокавага характару, ілюструе паэт.-песенны змест карагода. Карагоднікі, узяўшыся за рукі, рухаюцца па коле перыядычна са зменай напрамкаў (па сонцы — супраць ходу сонца) і спяваюць: «Заінька ў лес ідзёт, // Серанькі ў лес ідзёт, // Ой, да люлі, у лес ідзёт, // Ой, да люлі, у лес ідзёт //«...» // Заінька, пагуляй, // Серанькі, пагуляй, // Каго любіш, выбірай». Той, каго выбірае «заінька», мяняецца з ім месцам і роляй. Карагод пачынаецца спачатку. У некаторых варыянтах апошняя страфа песні суправаджаецца плясканнем у ладкі ці «трайным прытупам». Асн. рухамі карагоднікаў у розных традыцыях з'яўляюцца: «просты крок», ці «крок-прытуп», ці «трохкрок», або «камбінаваны крок», якія выконваюцца з рознымі пластычнымі інтанацыямі.

*Літ.*: Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т.: Т. 1—5. Мінск, 2001—11. *М.А.Козенка.*

**ЗАЙКО́ЎСКІ** Эдвард Міхайлавіч (н. 18.11.1952, в. Дубашы Валожынскага р-на), беларускі археолаг, культуролаг. Канд. гіст. навук (1985). Скончыў БДУ (1975). З 1980 у Ін-це гісторыі НАН Беларусі. Вывучае дахрысціянскую духоўную культуру, язычніцкія культавыя помнікі і мастацтва, этнічную гісторыю насельніцтва паўн. Беларусі ў першабытную эпоху і сярэдневякоўі. Даследаваў помнікі неаліту і бронзавага веку, культавыя камяні і крыжы ў Браслаўскім Паазер'і і Падзвінні. Адзін з аўтараў «Археалогіі Беларусі» (т. 1, 2000), навук.-папулярнай працы «Першабытныя помнікі Паўночнай Беларусі» (1990) і інш.

**ЗАЙМЕ́ННІК**, лексіка-граматычны клас *знамянальных слоў*, катэгарыяльным значэннем якога з'яўляецца ўказанне на прадмет (асобу, прыкмету, дзеянне). Асн. функцыя З. — замена паўназначнага слова. Па фармальна-граматычных прыкметах З. падзяляюцца на абагульнена-прадметныя (*я, сябе, нехта*), абагульнена-якасныя (*мой, самы, каторы*) і абагульнена-колькасныя (*колькі, столькі, гэтулькі*). Некаторыя даследчыкі адрозніваюць таксама абагульнена-акалічнасныя З. — т.зв. займеннікавыя прыслоўі (*дзе, там, аднойчы*). Па лексічным значэнні прынята вылучаць наступныя разрады З.: асабовыя (*я, ты, мы*), прыналежныя (*твой, наш, ваш*), указальныя (*гэты, той, такі*), азначальныя (*сам, увесь, кожны*), пытальна-адносныя (*хто, які, каторы*), адмоўныя (*ніхто, нішто, ніякі*), неазначальныя (*нехта, хтосьці, абы-які*) і зваротны З. (*сябе*). У сказе З. выконваюць функцыі, уласцівыя замененым часцінам мовы.

*Літ.*: Сцяшковіч Т.П. Займеннік у беларускай мове. Мінск, 1977; Беларуская граматыка. Ч. 1. Мінск, 1985; Шуба П.П. Сучасная беларуская мова. Марфаналогія. Марфалогія. Мінск, 1987; Кароткая граматыка беларускай мовы. Ч. 1. Марфаналогія. Мінск, 2007.

*Д.В.Дзятко.*

**ЗАЙЦАВА** Ларыса Мікалаеўна (н. 2.9.1946, г. Бабруйск), беларускі кіназнавец. Канд. мастацтвазнаўства (1992). Скончыла БДУ (1970). З 1999 працуе ў Бел. акадэміі мастацтваў. Даследуе гісторыю сусв. і айчыннага кіно, праблемы жанру ў кінематографе, экранізацыю літ. твораў. Аўтар манаграфіі «Праблемы жанру ў беларускім кінематографе» (1992), кн. «Жанравая палітра беларускага кіно» (1983). *Д.М.Гіргель.*

**ЗАЙЦАЎ** Дзмітрый Яўгенавіч (н. 26.3.1940, Мінск), беларускі кінааператар, рэжысёр. Засл. дзеяч мастацтваў Беларусі (1981). Скончыў Усесаюзны дзярж. ін-т кінематаграфіі ў Маскве (1969). Зняў фільмы: маст. «Іван Макаравіч» (1968), «Шчаслівы чалавек» (1970), «Рудабельская рэспубліка» (1971), «Вялікі трамп-